карыстацца нячыстымі спосабамі, хаця б гвалтам прыходзілася адбіраць у людзей чужой нацыі іх найдаражэйшы скарб — родную мову. Гэтак і Яніская парахвія дачакалася прыходу гэтай хваробы, каторая пасеяла тутака сваркі, бойкі, нянавісьць між людзьмі аднэй Зямлі, аднэй вёскі. „Нацыяналізм“, нацыянальная нянавісьць давялі некалькі людзей да такіх паступкаў, за якія суд назначае цяжкія кары.

За яніскія справы аддалі пад суд памешчыка Заянчкоўскага, пана двара ў Яніскай парахвіі, двух арандароў яго — двараніна Казелу і мешчаніна Іваноўскага, ды колькі сялян. „Інтэлігентаў“ вінавацілі ў тым, што яны за грошы, ласкай і страхам падбівалі тутэйшых сялян, каторыя лічаць сябе палякамі, каб не давалі літвінам маліцца ў касьцёле і слухаць казаньня па–літоўску; сялян жа вінавацілі, што яны, паслухаўшы намовы, ня толькі крыкам ды гоманам не пазвалялі народу пяяць па–літоўску, а ксяндзам — гаварыць казаньні, але і білі тых парахвіян, каторыя баранілі літоўскай мовы.

На суд паклікалі 85 душ сьведкаў, у тым ліку 13 ксяндзоў. Большая часьць іх пацьвярдзіла віну блізка ўсіх падсудзімых. Як паказвалі сьведкі, пан Заянчкоўскі разам з сваімі арандарамі даводзіў людзям, быццам літоўская мова — гэта мова „паганская“, і клікаў вывесьці яе зусім з касьцёла. „Пакуль маю рубель у каліце, — казаў быццам ён перад людзьмі, — не дапушчу, каб ксяндзы гаварылі казаньні па–літоўску“. Вышэйшай духоўнай уласьці пісалі жалабы ад імені парахвіян палякаў, быццам літвінаў у Яніскай парахвіі зусім няма і ніхто ня хоча маліцца па–літоўску. Калі ж у Янішкі прыехаў адміністратар Віленскай дыяцэзіі, кс. Міхалькевіч, каб распытацца, колькі ёсьць папраўдзе літвінаў і колькі палякаў, дык літвінамі прызналі сябе толькі 49 душ спаміж усяго сабранага ў касьцёле народу. А на судзе адкрылася, якім парадкам на літоўскай зямлі апынуліся адны толькі *польскія* сяляне з такімі прозьвішчамі, як Грыгасы, Шыманды, Кандраты, Жычкі, Буцькі і Політы: на дарозе ў Янішкі людзей з суседніх вёсак „пераймалі“ хаўрусьнікі Заянчкоўскага, а зь яніскай манапалькі прадалі ў той дзень 80 вёдзер гарэлкі...

За цкаваньне аднэй нацыі на другую, за падбіваньне сялян да беспарадкаў у касьцёле суд прыгаварыў пана Заянчкоўскага на год у астрог, Іваноўскага — на 8 месяцаў, Казелу — на 6 месяцаў; таксама засудзілі па паўгоду[1] і сялян „палякаў“, каторыя рабілі ў касьцёле скандалы і білі сялян–літвінаў.

Чы суд адкрые вочы ўсяго тутэйшага грамадзянства на тое, колькі бяды робяць нашай старонцы ўсялякія „нацыяналісты“, навязваючы народу ўсё чужое і сеючы сваркі між роднымі братамі? Спадзявацца гэтага трудна. Яніская справа — гэта ўжо ня першая звадка між шчырымі літвінамі, каторыя любяць і шануюць родную мову, і тымі абаламучанымі іх братамі, каторыя папраўдзе вераць, быццам літоўская мова — нягодная, паганская. А такіх паноў, як Заянчкоўскі, ёсьць вельмі многа як між сьвецкімі інтэлігентамі, так і між духоўнымі.

Пара, даўно пара літоўскім, а таксама і нашым беларускім сялянам зразумець, што яны належаць да аднэй мужыцкай сям’і, становяць адну нацыю, а ўсе стараньні „нацыяналістаў“ markdown рознага гатунку толькі аслабляюць сілы сялян, сілы вёскі. І няхай яніская справа не распальвае далей нянавісьці між роднымі братамі, а навучыць іх, што толькі згода і пашана да кожнай нацыі можа набліжаць для ўсіх ясьнейшую будучыну.

## Першы крок

Дзясяткі гадоў беларусу робіцца цяжкая крыўда: для яго роднай, беларускай мовы крэпка зачынілі дзьверы цэркві і касьцёла, загадалі маліцца па–чужому. За гэты час чужая мова зрабілася як бы сьвятой мовай, затое ж на сваю, усімі загнаную гутарку цёмныя людзі сталі самі скрыва паглядаць, сталі сароміцца яе. Але за апошнія гады на Беларусі прыручыліся вялікія перамены: народ, каторы сотні лет праспаў, разам збудзіўся, зразумеў, хто ён такі,

пазнаў у сябе *чалавека,* і жаданьне падняць і разьвіваць усё сваё, беларускае, жаданьне здабыць для роднай мовы прыналежнае ей месца распалілася ў сэрцах усіх сьвядомых беларусаў. Жаданьне гэтае абняло ўсе грамадзянскія арганізацыі, школы, цэркву, касьцёл. Ды шмат перашкод спаткала яно: толькі дзе–нідзе аб'явіліся між духавенствам сьвядомыя беларусы, каторыя ахвотна пачалі гаварыць да народу па–беларуску, дый то — *цішком.*

Толькі цяпер зроблен першы крок, каб палажыць канец старой крыўдзе; зрабіў яго галава каталіцкага касьцёла — Папеж[1], даўшы такі прыказ духавенству: *„Калі б у якой парафіі прыйшлося завясьці беларускую або ўкраінскую мову, дык зрабіць гэта трэба толькі тады, калі зажадаюць самі парафіяне; усялякія спорці аб гэта між духавенствам і парафіянамі будзе разьбіраць Апостальская Сталіца“* (сам Папеж).

Каталіцкі касьцёл гэтак вяртае беларусам *права* маліцца па–свойму; але *скарыстаць зь яго* мы здалеем толькі тады, калі ў нашым народзе шырэй і шырэй будзе разьвівацца нацыянальная сьвядомасьць, калі ён *сам пажадае* завядзеньня у касьцёл беларускай мовы. І каб дазваньня зьвясьці старую крыўду, мы павінны ямчэй узяцца за дружную работу, каб усе беларусы пазналі, хто яны, і прылажылі сваю руку да будоўлі новага жыцьця.

Шмат перашкод прыйдзецца нам перамагчы, пакуль настане новы парадак у касьцеле. Але першы крок ужо зроблен, і гэта мае аграмадную вагу. Вітаючы яго, мы выказваем шчырае жаданьне, каб па тэй жа дарозе пайшло і праваслаўнае духавенства, каб яно прызнала, *што і ў цэркві да беларусаў трэба гаварыць па–беларуску.*

## Край і народ

Кожын чалавек працуе дзеля таго, каб жыць. Жаданьне паддзяржаць сваё жыцьцё — гэта агульная мэта.

Так вядзецца ад найдаўнейшых часоў, і мэта працы людзей астаецца тая самая. Зьмяняецца толькі спосаб і форма яе.

Тысячы гадоў таму назад людзі жылі, быццам зьвяры, па лясох і карміліся мясам тых зьвяроў, каторых самі забівалі. Жылі яны ўсе паасобку або сваей невялічкай сям'ёй, бо іх дзеці, як падрасталі, ішлі далей сваей дарогай, пакідаючы бацькоў. Тады кожын глядзеў на другога, як на ворага: адзін у аднаго адбіваў пажыву. Цяжкія то былі часы: апрача сіл прыроды, з каторымі чалавек ня ўмеў змагацца, апрача дзікіх зьвяроў, што яго лёгка маглі зьніштожыць, — усюды прыходзілася перамагаць яшчэ і сваіх жа братоў–людзей за кусок мяса, за яду.

Мала–памалу людзі пераходзілі да працы на ральлі. Тут сям'я не разьбягалася па лясох за пажывай, каторай раней кожын шукаў толькі для сябе: тут была ўжо патрэбна супольная праца многіх рук, і сям'я пачала разрастацца. Гэтак складаўся род, а пазьней і цэльнае племя. Ведама, і тады кожын думаў перш–наперш аб сабе і сваей карысьці, але ўжо людзі зразумелі, што, працуючы разам, кожын больш і лягчэй прыдбае пажывы, чым працуючы асобна, дый ад дзікіх зьвяроў, ад ворагаў будзе зашчыта. Чалавек, працуючы для сябе, працаваў ужо крыху і для іншых. Быў заведзен разьдзел працы: каму што было пад сілу, хто да чаго быў складней, той і рабіў тое: хто зямлю выраблаў, хто на паляваньне хадзіў, хто хатнія работы рабіў, ці жывёлу даглядаў.

Разрасталіся роды, плямёны; паяўляліся гасударствы. І ўсюды, куды ні глянь, бачым адно: усё болей і болей разьвіваецца супольнае, грамадзянскае жыцьцё, і праца ўсяго племені, усяго народу вядзецца дзеля карысьці ўсіх разам і кожнага паасобку. Грамадзянская праца дзеля агульнай карысьці пераходзіць і за граніцы аднаго гасударства: яна агортвае ўвесь сьвет. І наш селянін, сеючы жыта, што пасьля паедзе ажно ў Англію, таксама памагае англічанам, як англічане, выдумваючы і робячы розныя машыны і прылады, прыносяць[1] карысьць нам.